http://edoc.bseu.by:8080/

# МОЙ КРАЙ ДАРАГІ, СТАРОНКА МАЯ

***2018 год аб'яўлены ў Беларусі Годам малой радзімы. Кожны захоўвае ў сваім сэрцы вобраз горада, мястэчка, вёскі, хутара, дзе з'явіўся на свет. Хтосьці з болем разумее, што яго малой радзімы больш няма: вайна таму віной, вялікія перабудовы апошняга вірлівага стагоддзя ці Чарнобыльская катастрофа... Людзі прыкладаюць намаганні, каб іх родны куток стаў больш прыгажэйшы, развіты, цікавы.***



Бібліятэка БДЭУ не змагла застацца па-за межамі такой маштабнай з'явы. У вянок мерапрыемстваў, прысвечаных Году малой радзімы, уплецены наш віртуальны фотапраект "Мая Беларусь", які пазнаёміць з цудоўнымі куточкамі роднай краіны. Шчыра кажучы, многія з нас добра ведаюць выдатныя мясціны Польшчы, Расіі, Турцыі, Грэцыі ці Егіпта... А свая краіна застаецца неадкрытай Атлантыдай. А пабачыць тут ёсць што, паверце! Заклікаем вас далучацца да акцыі: выстаўляць фотаздымкі сваёй малой радзімы ці іншай славутасці (храм, замак, скульптура і інш.), якая вас уразіла, у сацыяльных сетках з хэштэгамі #МаяБеларусь, #ПазнаемБеларусьРазам, #ГодМалойРадзімы і кароткім апісаннем (назва, год заснавання, кароткая гісторыя і свае ўражанні).

Вялікаму гораду, які стаў родным для многіх тысяч жыхароў нашай краіны, сваёй малой радзіме – Мінску – прысвяціла сваю фотавыставу супрацоўніца бібліятэкі БДЭУ Таццяна Кучынская. Яе цудоўныя фотаздымкі адлюстравалі прыгажосць горада, якую мы ўжо не бачым у штодзённым тлуме і мітусні. Мінск – горад, дзе скрозь сучаснасць праглядвае даўніна, дзе побач суседнічаюць XXI і XVIII стагоддзі, што і падкрэсліваюць параўнальныя здымкі аднаго і таго ж месца (вуліцы, дома) у розны час. Цікавым і вельмі інфарматыўным дадаткам фотапрасторы сталі тэкставыя фрагменты з апісаннем розных гарадскіх славутасцей. Можна і паглядзець, і пачытаць.

Асобны віртуальны шпацыр наведвальнікі выставы могуць зрабіць у незвычайнае месца, дзе сышліся жалезны век, усе перапетыі і трагедыі бурлівага XX стагоддзя і пераўтварэнні стагоддзя цяперашняга. Так-так, гаворка пра Лошыцкі парк! Фотазамалёўкі Таццяны ў спалучэнні з фрагментамі з гісторыі парка выклікаюць жаданне адразу наведаць гэтае цудоўнае месца.

Выстава «Мой край дарагі, старонка мая...» будзе экспанавацца ў чытальнай зале перыёдыкі да канца мая.

***А.Барэцкая, вядучы бібліятэкар***

***Фота Т.Кучынскай***